Дзяржаўная ўстанова культуры
"Цэнтралізаваная бібліятэчная сетка
Асіповіцкага раёна"
*Цэнтральная раённая бібліятэка*

*Серыя «Героі Савецкага Саюза – вызваліцелі Асіповіцкага раёна»*

# У ПАМЯЦІ НАШАЙ ГЕРОІ ЖЫВЫЯ



## УЛАСЕНКА Сяргей Платонавіч

# УЛАСЕНКА
# Сяргей Платонавіч

**(26.06.1909 –22.09.1944)**

## БІЯГРАФІЧНАЯ ДАВЕДКА



**Уласенка Сяргей Платонавіч - камандзір гарматы 280-га гвардзейскага знішчальна-супрацьтанкавага артылерыйскага палка, трэццяй гвардзейскай знішчальна-супрацьтанкавай артылерыйскай брыгады 65-й арміі 1-га Беларускага фронту, гвардыі старэйшы сяржант.**

**Нарадзіўся 26 чэрвеня 1909 года ў сяле Яблынева Оржыцкага раёна Палтаўскай вобласці ў сям'і селяніна. Украінец. Вучыўся ў мясцовай няпоўнай сярэдняй школе. Працаваў грузчыкам на млыне у Міргарадзе.**

**У 1939 годзе прызваны ў рады Чырвонай Арміі. Прымаў удзел у вызваленчым паходзе савецкіх войскаў у Заходнюю Украіну ў 1939 годзе. У баях Вялікай Айчыннай вайны з 1942 года. Ваяваў на**

**Бранскім, Цэнтральным і 1-м Беларускім франтах. Канец 1941года і ўвесь 1942 годёнправёў у баях пад Арлом, на Курскай дузе і пад Сталінградам.**

**За паспяховае выкананне баявых заданняў быў узнагароджаны ордэнам “Айчыннай вайны” II ступені. Удзельнічаў у аперацыі “Баграціён”. Фарсіраваў Днепр і Друць, вызначыўся ў баях за вызваленне Магілёўскай і Мінскай абласцей.**

**22 жніўня 1944 года Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР гвардыі старэйшы сяржант Сяргей Платонавіч Уласенка быў удастоены звання Героя Савецкага Саюза.**

**У верасні 1944 года ў ходзе баёў за вызваленне Польшчы С.П.Уласенка быў цяжка паранены і адпраўлены ў палявы шпіталь. Да гэтага часу на яго баявым рахунку было шэсць танкаў, пяць гармат, дзевяць аўтамашын, два мінамёты, сем кулямётаў, два цягачы і звыш 250 салдат і афіцэраў праціўніка.**

**22 верасня 1944 года бясстрашны артылерыст Сяргей Платонавіч Уласенка загінуў падчас налёту на шпіталь варожых самалётаў.**

**Імя Героя носіць вуліца ў роднай вёсцы. У сельскім краязнаўчым музеі сабраны матэрыял аб яго слаўным баявым шляху.**

**У горадзе Міргарад на алеі Славы ўсталяваны бюст Героя.**



**Помнік С.П. Уласенка ў парку “Вечнай славы”
у Міргарадзе.**

**3 ліпеня 2004 года быў усталяваны помнік Герою Савецкага Саюза Уласенка Сяргею Платонавічу ў г.Асіповічы на алеі Герояў.**

# ГІСТОРЫЯ ПОДЗВІГУ

**Гвардыі старэйшы сяржант С.П.Уласенка27 чэрвеня 1944 годаадважна змагаўся каля вёскі Сычкава Бабруйскага раёна. Уласенка пад артылерыйскім, мінамётным і кулямётным абстрэлам праціўніка выкаціў сваюгармату на адкрытую агнявую пазіцыю і прамой наводкай адкрыў агонь па фашыстах. Ён знішчыў пяць аўтамашын і дзясяткі гітлераўцаў.**

**30 чэрвеня 1944 года гарматны разлік Уласенкі вёў бой за авалоданне плацдармам на левым беразе ракі Свіслач ля чыгуначнай станцы Лапічы Асіповіцкага раёна Магілёўскай вобласці.Гітлераўцы зрабілі ўсё магчымае, каб утрымацца на гэтым рубяжы, не дапусціць прасоўвання часцей Чырвонай Арміі да Мінска. Гармата Уласенкі падбіла танк і гармату немцаў. У самы напружаны момант бою з-за дамоў вышла некалькі варожых танкаў. Яны накіраваліся на пазіцыю Уласенкі. Становішча складавалася не на карысць артылерыстаў. Сілы былі няроўныя, трэба было нешта рабіць. Артылерысты непрыкмента для ворага залезлі на дах дома і падрыхтаваліся. У кожнага было некалькі проціватанкавых гранат. Гітлераўцы не бачылі і не чакалі, што гармата стаіць без байцоў. Калі танкі падышлі да дома з даху**

**на іх паляцелі гранаты. Варожы дэсант кінуўся бегчы. Танкі не прайшлі. Але па дому адкрыла агонь схаваная ворагам гармата. Уласенка быў цяжка паранены, але знайшоў у сабе сілы дабрацца да сваёй пазіцыі і трапным агнём знішчыў гітлераўскую агнявую кропку. Фашысты насядалі. Артылерысты адбілі ўжо пяць атак, не было часу перавязаць раны, а бой усё ішоў. Пасля восьмай атакі гітлераўцы змоўклі і адступілі. На полі бою засталіся два гітлераўскія танкі, гарматы і шматлікія трупы захопнікаў. Разлік гвардзейцаў выканаў сваю задачу.**

**Сяргею Платонавічу Уласенка за мужнасць, адвагу і кемлівасць у гэтым баі з гітлераўцамі было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.**



33

70 Все графы заполнять полностью

Героя Советского Союза

# НАГРАДНОЙ ЛИСТ

1. Фамилия, имя и отчество Власенко Сафрон Платонович
2. Звание гвардии старший сержант 3. Должность, часть командир орудия 280 гвардейского истребительно противотанкового артполка 5-ой отдельной гвардейской истребительно противотанковой артиллерийской бригады ордена Ленина Кутузова РГК

Представляется к присвоению звания „Героя Советского Союза"

4. Год рождения 1909 5. Национальность украинец 6. Партийность член ВКП(б)
7. Участие в гражданской войне, последующих боевых действиях по защите СССР и отечественной войне (где, когда) с июня 1941 г. по март 1943 г. Брянск. фр. с марта 1943 г. по октябрь 1943 г. Центральн. фр. с октября 1943 по апрель 1944 г. Белор. фр. с апреля 1944 г. 1-й Белор. фр.
8. Имеет ли ранения и контузии в отечественной войне тяжело ранен на 1 Белор. фр. 1.7.1944 г.
9. С какого времени в Красной Армии с июня 1941 года 10. Каким РВК призван Миргородским Полтавской области
11. Чем ранее награжден (за какие отличия) орден „Отечеств. войны" II степ. прик. Ком. артиллерии Центральн. фрон. №0 от 1.7.
12. П...

## I. Краткое, конкретное изложение личного боевого подвига или заслуг

Тов. ВЛАСЕНКО С.П. в наступательных боях с 24.6.44г. по 1.7.44г. за освобождение Советской Белоруссии проявил смелость, бесстрашие и геройство. 27.6.44г. в бою у д. СИЧКОВО артиллерийско-минометным и ружейно-пулеметным огнем, выкатив свое орудие на открытую ОП, в упор расстреливал автоматчиков, уничтожил при этом 30 немцев, 8 автомашин, и захватил в плен 4-х немецких солдат. 30 июня в уличных боях на плацдарме занятом батареей на левом берегу р. СВИСЛОЧЬ в с. ЛАПИЧИ Минской обл. в исключительно сложной и тяжелой обстановке уничтожил два танка. Тов. ВЛАСЕНКО презирая смертельную опасность, вручную подкатил орудие на 50 м. и расстрелял танк. За домом стоял второй танк с 10 автоматчиками, куда орудие подкатить было нельзя; тогда тов. ВЛАСЕНКО пробрался на второй этаж дома с противотанковыми гранатами и оттуда уничтожил танк вместе с автоматчиками. При взрыве второго танка тов. ВЛАСЕНКО был ранен. Будучи тяжело раненым он не покинул поле боя. Обнаружив в 150 м. тщательно замаскированную пушку противника, сполз со второго этажа дома, добрался до своего орудия и с одного выстрела уничтожил обнаруженную пушку. В этот день противник предпринял на расчет тов. ВЛАСЕНКО 8 контратак, но тов. ВЛАСЕНКО, будучи раненым все их успешно отбил, уничтожив при этом свыше 70 гитлеровцев. После этого, несмотря на его отказ, он был уведен с поля боя и отправлен в госпиталь. Смелость, умение и героизм тов. ВЛАСЕНКО проявлял и во всех предыдущих боях. Тов. ВЛАСЕНКО на своем счету имеет уничтоженными 6 танков, 5 орудий, 9 автомашин, 5 повозок с военным грузом, склад боеприпасов, 3 миномета, 7 станковых пулеметов, 2 тягача с пушками и 355 солдат и офицеров противника.

Тов. ВЛАСЕНКО достоин высшей Правительственной награды - присвоения звания „ ГЕРОЙ СОВЕТСКОГО СОЮЗА ".

КОМАНДИР 280 ГВАРДЕЙСКОГО ПОЛКА
ГВАРДИИ ПОЛКОВНИК /ЖЕЛЕЗНИКОВ/

10 июля 1944 года.

# ЛІТАРАТУРА


1. Власенко Сергей Платонович – Герой Советского Союза, участвовал в боях за плацдарм на левом берегу Свислочи у д.Лапичи // Навечно в сердце народном. -- Мн., 1984.-- С.97.
2. Власенко С.П.// Герои Советского Союза : краткий биограф.словарь. В 2т. Т.1.--Мн., 1987. -- С.271--272.
3. Вызваленне // Памяць. Асіповіцкі раён.--Мн., 2002.-- С. 306.
4. Власенко Сергей Платонович / Электронный банк документов «Подвиг народа в Великой Отечественной войне 1941-1945 гг. – Режим доступа :http://www.podvignaroda.mil.ru